на развітанне

# Ён быў аптымістам...



Амаль да апошніх дзён жыцця ён быў нязменным аптымістам, выкладчыкам, поўным энергіі і энтузіязму, нястомным даследчыкам традыцыйнай культуры і тэорыі фальклору, філосафам і выдатным дарадцам для студэнтаў і калег. Але днямі прыйшла сумная вестка. Доктар філасофскіх навук, прафесар кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Энгельс Дарашэвіч пакінуў гэты свет...

Уся навуковая супольнасць краіны ды і замежжа ведае Энгельса Канстанцінавіча як аднаго з заснавальнікаў культуралогіі, сацыёлага культуры, гісторыка навукі, выдатнага педагога. Яго навуковыя гіпотэзы, часам смелыя і нечаканыя, знайшлі ўвасабленне ў многіх артыкулах і манаграфіях, адгукнуліся працягам у магістарскіх і кандыдацкіх дысертацыях вучняў і наступнікаў. Пэўны час працаваў выкладчыкам Горы-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, быў супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР, а на працягу апошняга дзесяцігоддзя займаў пасаду прафесара БДУКМ.

Нягледзячы на паважаны ўзрост, Энгельс Дарашэвіч ніколі не думаў пра адпачынак. З энтузіязмам браў удзел у студэнцкіх вандроўках, фестывалях, канцэртах. Спяваў народныя песні, мог нават станчыць на вечарыне.

Крыху больш як год таму ў інтэрв'ю карэспандэнту «ЛіМа» прафесар падкрэсліваў: «Як антраполаг магу зазначыць наступнае: у свеце сёння ідзе вялікая хваля павелічэння цікавасці да аўтэнтыкі. Многія даследчыкі лічаць, што толькі вяртанне да аўтэнтыкі можа выратаваць свет, грамадства». І ў многім гэтую хвалю ўздымае нястомная праца такіх выдатных навукоўцаў, якім, на жаль, ужо быў Энгельс Канстанцінавіч.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ